РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*А. Кавалёў*

**Падэспань**

Падэспань — бытавы танец рускага паходжання. Аўтар падэспаня і музыкі да яго — артыст Вялікага тэатра А. А. Царман (Масква, 1898 г.). Пры стварэнні гэтага твора аўтар выкарыстаў характэрна-сцэнічныя элементы іспанскага танца. Падэспань хутка заваяваў папулярнасць ва ўсёй Расіі, як у гарадах, так і ў вёсках, дзе, аднак, набыў іншую, больш простую харэаграфічную форму. У Беларусі падэспань вядомы з пачатку XX ст. Танец мае простую кампазіцыю, заснаваную на спалучэнні дзвюх фігур: пераменнага кроку і вярчэння. Выконваецца парамі ў суправаджэнні інструментальнай музыкі і прыпевак. Да нядаўняга часу ён бытаваў на тэрыторыі ўсёй Беларусі. Зараз захоўваецца ў танцавальнай культуры некаторых мясцовасцей (напрыклад, у Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці і Слаўгарадскім раёне Магілёўскай вобласці). Музычны памер — 3/4, тэмп умераны. Зрэдку «Падэспань» уключаецца ў «Кадрылю», у сувязі з чым змяняецца яго характар і метрарытм.